# Дарослыя – прыклад паводзінаў на дарозе

21.02.2020 15:45, Гомельшчына

**Правілам дарожнага руху мы вучым дзяцей з дашкольнага ўзросту. У дзіцячым садзе дзіця павінна засвоіць асноўныя паняцці пра дарожны рух, а таксама навучыцца найважнейшым правілам паводзін на дарозе.**



Штогод у санаторным яслях-садзе Брагіна арганізоўваецца спартыўны вольны час “Школа бяспекі”. Актыўны ўдзел прымаюць супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі. Сёлета правілам дарожнага руху выхаванцаў вучыў інспектар дарожна-патрульнай службы аддзялення ДАІ Брагінскага РАУС капітан міліцыі Аляксей Гардзейчык.

Дзеці разгадвалі загадкі, выконвалі прыпеўкі, а галоўнае – у гульнявой форме ацэньвалі бяспеку паводзін на вуліцах і дарогах. Не абышлося без гарэзы Машы і яе сяброў, прыляцеў у госці і Лунцік. Героеў мультфільмаў ігралі выхавальнікі, якія лёгка пераўвасабляліся ў паслухмяных вучняў “Школы бяспекі”. На свяце быў макет святлафора, дзецям трэба было выканаць заданні на кожны яго колер. Мерапрыемства праводзілася ў зале, дзе была пабудавана імправізаваная дарога з дарожнымі знакамі, скрыжаваннем і пешаходным пераходам. У гульнях дзеці пабывалі і пешаходамі, і пасажырамі, і кіроўцамі.




Колькі сігналаў у святлафора? Навошта патрэбен святлафор? Як завецца чалавек, які водзіць машыну? Для чаго патрэбен пешаходны пераход? Дзе трэба чакаць аўтобус? Як паводзіць сябе ў грамадскім транспарце? На гэтыя і іншыя пытанні супрацоўніка ДАІ малыя трымалі адказ на “выдатна”.

Для далучэння бацькоў да работы па прафілактыцы дзіцячага дарожна-транспартнага траўматызму, да спартыўнага вольнага часу “Школа бяспекі” была прымеркавана выстава малюнкаў, якія дзеці выконвалі сумесна з бацькамі. Пастаяннымі ўдзельнікамі ўсіх выстаў сталі сем'і Вікторыі Грэсь, Андрэя Повада, Аліны Пятніцкай, Ціхана Пархамца, Рамана Краўчанкі.



У мэтах прафілактыкі дарожна-транспартнага траўматызму супрацоўнікі ДАІ выступаюць на бацькоўскіх сходах. Каб навучыць нашых дзяцей навыкам правільных паводзін на вуліцы, дарозе, патрэбна карпатлівая, паўсядзённая тлумачальная праца. Бацькі павінны памятаць пра асабісты прыклад. Вядома ж, калі дарослыя самі парушаюць правілы дарожнага руху, пераходзяць вуліцу ў недазволеным месцы, не рэагуюць на сігналы святлафора, то самая добрасумленная праца выхавальнікаў будзе не дзейснай.

**Алена МАКАРАНКА,**
**кіраўнік фізічнага выхавання санаторнага ясляў-сада Брагіна.**

Share 0 Сохранить

Пошук

ДА ЧЫТАЧА

ДЛЯ АЎТАРАЎ

Адукацыя ў асобах




Папулярныя публікацыі



Залатыя правілы
Мінск,05.06.2019 14:20



А ў нашай школе свята!
Брэстчына,15.02.2019 10:23



Камаедзіца, або Першыя крокі ў мінуўшыну
Гомельшчына,03.04.2019 15:35



Самая музычная сям'я
Гродзеншчына,24.04.2019 16:00



Незвычайная экскурсія
Мінск,23.02.2019 13:30


© NG-PRESS 2020